**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ**
**САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ**
**ІНСТЫТУТА ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ**

запрашаюць прыняць удзел у VI міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі

# «ARS LONGA: НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ»

**Час правядзення:** 27–28 красавіка 2023 г.
**Месца правядзення:** Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1 (праезд і пражыванне ўдзельнікаў за кошт камандзіруючага боку)
**Працоўныя мовы:** беларуская, руская.
**Форма ўдзелу ў канферэнцыі:** вочная (з магчымасцю далучэння і выступлення online)

**Праблемнае поле канферэнцыі:**

1. Метадалогія гісторыі, гістарыяграфія, крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя навукі.
2. Даследаванні ў галіне археалогіі і антрапалогіі.
3. Гісторыя Беларусі.
4. Даследаванні ў галіне сусветнай гісторыі і міжнародных адносін.
5. Методыка выкладання гісторыі ў навучальных установах.

Да ўдзелу запрашаюцца студэнты, магістранты, аспіранты і маладыя вучоныя. Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна да **14 сакавіка 2023 г.** даслаць заяўку і тэкст артыкула на электронны адрас arslonga2019@gmail.com.

**У заяўцы неабходна пазначыць:** прозвішча, імя і імя па бацьку; вучоную ступень і званне; назву ўстановы, пасаду; назву даклада; форму ўдзелу (вочна/online); кантактны тэлефон; e-mail.

**Патрабаванні да афармлення тэксту**: агульны аб’ём (які ўключае анатацыю і спіс літратуры) – не болей за 30 000 знакаў з прабеламі. Мова выкладу беларуская або руская, тэкст павінен адпавядаць крытэрыям навуковасці і правілам арфаграфіі, даваць поўнае ўяўленне аб характары разглядаемай праблемы. Тэкставы рэдактар Microsoft Word, шрыфт Times New Roman, 12 pt, інтэрвал – адзінарны, усе палі – 20 мм. У тэксце дапускаецца выкарыстанне адной ілюстрацыі (дасылаецца асобным файлам у фармаце TIFF або JPEG з пашырэннем не менш за 300 dpi). **Спасылкі пастаронкавыя**, нумарацыя спасылак на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання не падаюцца.

**Тэкст павінен утрымліваць наступныя элементы:**

- код УДК (размяшчэнне па левым баку);
- назва артыкула (друкуецца вялікімі літарамі тлустым шрыфтам з размяшчэннем па цэнтры на беларускай / рускай мове (у залежнасці ад выкладу) і англійскай мове);
- ініцыялы і прозвішча аўтара (аўтараў) артыкула на рускай / беларускай і англійскай мовах (размяшчэнне па цэнтры);
- месца працы / вучобы на беларускай / рускай і англійскай мовах (назва ўстановы адукацыі / арганізацыі, горад (размяшчэнне па цэнтры);
- анатацыя да 10 радкоў, друкуецца курсівам на беларускай / рускай і англійскай мовах (выраўноўванне па шырыні);
- ключавыя словы друкуюцца курсівам (да 10 слоў, аддзяляюцца адзін ад аднаго кропкай з коскай) даюцца на беларускай / рускай і англійскай мовах.

Тэксты артыкулаў студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў суправаджаюцца **рэцэнзіяй навуковага кіраўніка**. Артыкулы будуць **правярацца на плагіят**, у выпадку значнай колькасці запазычанасцей матэрыял будзе адхілены. Матэрыялы, **якія не адпавядаюць** праблемнаму полю канферэнцыі, крытэрыям навуковасці і правілам афармлення, або якія патрабуюць значнай рэдактарскай дапрацоўкі, **не будуць разглядацца.** Арганізацыйны камітэт **не тлумачыць прычыны** магчымага адхілення заявак. Персанальныя запрашэнні будуць накіраваны па выніках адбору заявак не пазней **за 1 красавіка 2023 г**. Па выніках працы канферэнцыі будзе **выдадзены зборнік навуковых** артыкулаў.

*Кантакты арганізацыйнага камітэту:*

**Таццяна Даўгач** +375 25 545-93-93 *E-mail:* arslonga2019@gmail.com
**Ганна Ясковіч** +375 29 871-73-79
**Дар’я Пыж** +375 33 638-39-75

**<u>Узор афармлення артыкула:</u>**

УДК 94 (376)

**РОЛЬ ИВАНА ИВАНОВИЧА ИВАНОВА**
**В СОВРЕМЕННОЙ БЕЛОРУССКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ**

**THE ROLE OF IVAN IVANOVICH IVANOV**
**IN MODERN BELARUSIAN HISTORIOGRAPHY**

Иванов И. И.
Ivanov I. I.

Институт истории НАН Беларуси, г. Минск, Республика Беларусь
Institute of History of the NAS of Belarus, Minsk, Republic of Belarus

*Аннотация.*
*Abstract.*
*Ключевые слова:*
*Keywords:*

Текст, текст, текст[1], текст[2]
…

[1] Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст., Мінск : Навука і тэхніка, 1978. С. 28
[2] Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст., с. 30